Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

БЕЛАРУСКІ ЗВОН

Радыкальная тыднёвая часопіс

Цана асобнага нумару 20 гр.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Ліпоўка 18.

Адрэс для карэспандэнцыі і падпіскі: паштовая скрынка № 19.

ПРЫЙМО ІНТЭРЭСАНТАЎ ад 10 да 2 гадз. што-дня, апрача сьвятаў і нядзель.

Падпіска з дастаўкай да хаты: на 1 год – 6 зл., за паўгоду – 3 зл., за 3 мес. – 2 зл., за 1 мес. – 50 гр.

Год I. Вільня 12 траўня 1931 г. № 11

ДЫВЭРСАНТЫ.

Калі некаму можа здавацца, быццам беларуская незалежніцкая ідэя — гэта нешта нерэальнае, нейкае пустое лятуценьне, якому ня суджана збыцца, — дык тое, што сягоньня хочам падаць увазе нашых чытачоў, мусіць пераканаць іх у нечым процілежным.

Хто страляе з гарматаў — у вераб'ёў? Хто ваюе матэрыяльнымі прыладамі — з пустымі ценямі? — Ясна, што ніхто. І з беларускай незалежніцкай ідэяй ды з яе творцамі і прадстаўнікамі ніхто-б не ваяваў, калі-б запраўды была яна пустым ценям. А што яна, наадварот, ёсьць бясспрэчная рэальнасьць, на гэта паказуе факт, што ў працягу апошняга дзесяцігодзьдзя дзяржаўныя ўлады некалькіх краін вялі, або і сягоньня вядуць дывэрсыйную акцыю сярод беларусаў, якая мае на мэце знутра раскладаць беларускае грамадзянства і падрываць беларускую нацыянальную сілу ды гэтак пазбаўляць незалежніцкую ідэю тае падставы, на якой яна толькі і можа быць зьдзейсьнена.

Спрытна абдуманая дывэрсыйная акцыя ў беларускім грамадзянстве паставіла сабе лёзунг: „зьбіваць галавы беларускага руху“, брудзіць і ганьбаваць тых павадыроў беларускага адраджэньня, якія сваей шматгадовай працай і творчай думкай паднялі наш занпалы, яшчэ так нядаўна зусім нясьведамы народ з палажэньня паднявольнага і безгалосага раба на палажэньне вольнага і незалежнага гаспадара ў сваім краі. Першыя, як усе памятаюць, распачынаюць дывэрсыйную „працу“ — задоўга да маёвага перавароту ў Польшчы — Аляксюкі, Валэйшы, Паўлюкевічы і ім падобныя, якія, добра пакарміўшыся з ведамае крыніцы ды закідаўшы край рознымі бруднымі пісанінамі, пэцкаўшымі перад усім творца акту 25 марца 1918 году, грам. Антона Луцкевіча, на гэтым і супакойваюцца. А ў той жа час на таго ж Луцкевіча і яго найбліжэйшых супрацоўнікаў у дзеле будаваньня незалежнай Беларусі цікаваў усходні сусед Польшчы: СССР. Але СССР пайшоў іншым шляхам: даючы пэўныя ўступкі беларусам у Усходняй Беларусі, якая атрымала нават назоў „незалежнай“ Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, савецкая ўлада старалася сьцягнуць у Менск усіх незалежніцкіх дзеячоў, каб цяпер усіх-жа іх „унешкадліваць“, замыкаючы ў лёхах ГПУ... Калі-ж тыя беларускія незалежнікі, якія ня мелі ахвоты перабірацца на Усход, адмовілісяператварыць Грамаду ў паслухмянае арудзьзе Масквы, тады проці гэных непакораў Маскоўскі ўрад распачаў такую-ж дывэрсыйную акцыю, знайшоўшы сабе за грошы агентаў спасярод саміх беларусаў і іхнімі рукамі стараючыся забіць маральна тых, хто аказаў адпор валадаром СССР. Называць гэтых савецкіх наймітаў ня будзем: імёны іх лішне добра ведамы ўсім.

Але ў сувязі з арганізацыяй і нязвычайна магутным разростам Грамады распачынае сваю — ужо трэцюю з чарады — дывэрсыйную акцыю сярод беларусаў і трэцяя дзяржава, акурат тая, якая прагавіта чакае, каб у адпаведні мамэнт — карыстаючыся дапамогай запрадаўшыхся ёй беларусаў — хапануць Віленшчыну і Гарадзеншчыну. Гэтая дзяржава была вельмі ўстрывожана, калі Грамада выставіла лёзунг аб'яднаньня ўсіх беларускіх зямель у незалежнай Беларускай дзяржаве, абыймаючы і Віленшчыну, і Гарадзеншчыну. А калі яшчэ Комінтэрн быў заявіў, што справу аб тым, каму мае належыць Вільня, вырашаць працоўныя масы Заходняе Беларусі, — тады ў Коўні паднялася цэлая бура! Паляцелі ў Маскву дыплёматычныя запытаньні: ці Масква шануе ўмовы свае, зробленыя з Літвой, і як разумець заяву Комінтэрну? Атрымаўшы-ж таксама дыплёматычны адказ, што заявы Комінтэрну не абавязываюць ураду СССР, Літва кінулася на спрактыкаваны ўжо другімі шлях дывэрсыйнае работы сярод беларусаў, нібы то ў імя „братніх пачуцьцяў“ да беларусаў дапамагаючы грашыма тым спасярод іх, хто згадзіўся за юдавы срэбнікі шляхам усялякае ілжы і паклёпаў далей „зьбіваць галовы руху“, маральна брудзіць тых, хто ні за срэбнікі, ні за пасольскія мандаты не згаджаўся зламаць акт 25 марца 1918 году. Мала таго: пакорпае цялятка дзьве маткі ссе! Дык і ковенскія найміты ня грэбавалі і другой крыніцай даходу, бяручы на тую-ж мэту: разьбіваньне „да канца“ разгромленае ўжо польскімі ўладамі за процідзяржаўную дзеяльнасьць Грамады — паважныя сумы і ад польскае дэфэнзывы... І пасыпаліся на страніцах прадажніцкае прэсы даносы на беларускіх дзеячоў грамадаўскага кірунку, з якіх, ясна-ж, карыстала польская пракуратура, вылаўліваючы тых, хто яшчэ быў на волі і далей пашыраў у масах грамадаўскую ідэолёгію.

Ці не паказальнае гэтае зацікаўленьне справай беларускае незалежніцкае працы ўладаў некалькіх дзяржаваў? І ці не гаворыць яно нам красамоўна аб тым, што — ня гледзячы на страшэннае спадленьне часткі нашага грамадзянства — ідэя незалежнасьці вольнае і аб'яднанае Беларусі жыве і ўсё яшчэ мае сілу?

Ад Рэдакцыі.

Наша стацьця пад назовам „Праца ці лякайства?“, як і трэба было спадзявацца, выклікала вялікую трывогу ў хадэцкім лягеры. Факт, што кс. Станкевіч браў грошы на барацьбу з „Грамадой“ — праз пасрэдніцтва пасла Ярэміча — ад польскіх уладаў, пэўне-ж, мусіў абурыць тых, з чыйго карыта корміцца сягоньня ўся гэная цёплая кампанія. Трэба было неяк „апраўдацца“ перад сваімі хлебадаўцамі. І вось нашыя „юдушкі“ надумалі гэткі спосаб „апраўданьня“.

Галоўны гэршт і маральны вінавайца арыштаў не аднаго з дзеячоў грамадаўскага кірунку, кс. Адам Станкевіч, сядзіць ціха і ня рыпаецца. За тое-ж дзеля „апраўданьня“ ён спрытна высунуў ня менш за яго зацікаўленага ў гэтай справе пасла Ярэміча. Той пасылаў да рэдактара нашае часопісі, грам. Сіняўскага, двух сваіх паўнамоцнікаў — былага сэнатара Багдановіча і пейкага Найдзюка, якія — ад імя Ярэміча — патрэбавалі выяўленьня імені аўтара стацьці і ганаровага суда ў справе нашае рэвэляцыі. Гэтыя трэбаваньні рэдактар Сіняўскі, пэўне-ж, пакінуў без адказу, бо ж сьмешна гаварыць аб „ганаровым“ судзе з чалавекам, якому закідаецца такі грэх, як прадаваньне за грошы беларускіх дзеячоў! Тады п. п. Багдановіч і Найдзюк напісалі свой „пратакол“, які зьмясьцілі, ведама-ж, у органе кс. Станкевіча, ды ў ім „пастанавілі“, што — раз рэдактар Сіняўскі ня хоча ганаровага суда з Ярэмічам, дык Ярэміч „маець права ўважаць сябе рэгабілітаваным (знача: апраўданым!) у інкрымінаваным яму ўчынку“.

Слова „пратакол“, ужытае п. Багдановічам, нікога аднак ня можа ашукаць адносна вартасьці і вагі яго „пастановы“. І мы, ня гледзячы на гэтую „пастанову“, лічыць Ярэміча (чаму-ж не кс. Станкевіча?) „абеленым“ бяз суда ня можам. Адмаўляючыся ад усялякае ганаровае расправы з падобнымі дзеячамі, прапануем ім абодвум падаць на нас жалабу ў каронны суд, як гэтым рэдактару Сіняўскаму і паграж ялі п. п. Багдановіч і Найдзюк.

Дык чакаем на такі публічны, адкрыты суд, сьцьвярджаючы толькі, што кс. Станкевіч і Ярэміч, пасылаючы грам. Сіняўскаму вызаў у „ганаровы“ суд, хіба-ж ведалі наперад, што мы суда ганаровага з імі ня прымем.

Ухіленьне кс. Станкевіча і Ярэміча ад кароннага суда будзем лічыць раўназначным з прызнаньнем іх да цяжкога, процігрaмадзкага і процінацыянальнага праступку. Каб жа-ж за ім пайшло нарэшце і пакаяньне!

Ня можам пры гэтым прайсьці міма паступку і б. сэнатара Багдановіча, які ў сваім сьмешным „пратаколе“, маючым сьвядомую мэту некага абаламуціць, зьмяшчае недапусьцімую ў гэткага роду дакумэньце лаянку па адрасу рэд. Сіняўскага. Гэтым сваім паступкам грам. Багдановіч паставіў сябе на адзін ровень з тым, ад чыйго імя ён выступаў, паказаўшы адначасна, што, узяўшыся за фабрыкаваньне свайго „пратаколу“, ён ня меў паняцьця аб ганаровых расправах наагул.

АКАДЭМІК Е. Ф. КАРСКІ.

Толькі цяпер у газэтах зьявіўся перадрук паведамленьня савецкае прэсы аб вялікай утраце беларускага навуковага сьвету: 29 красавіка памёр у Ленінградзе найвыбітнейшы беларускі філёлёг, акадэмік Е. Ф. Карскі.

Імя Карскага ведама ў-ва ўсім культурным сьвеце, сярод якога ён папулярызаваў беларускую справу сваімі навуковымі працамі аб беларускай мове. У 1886 годзе выйшла яго першая кніжка пад назовам „Агляд гукаў і форм беларускае мовы“ (у расейскай мове). А сьледам за ёй у даўжэйшых адступах часу выходзіць часткамі капітальная праца яго п. н. „Беларусы“ (ізноў-жа ў расейскай мове), якая ў сваіх сямёх вялікіх томах творыць падставу для навуковых досьледаў аб беларускай мове, ды з яе ж паўстае і навукова апрацаваная Бр. Тарашкевічам практычная граматыка беларускае мовы. У апошнія гады ў Бэрліне выйшла даволі вялікая праца яго аб беларусах у нямецкай мове.

У кароткай заметцы, пісанай насьпех пасьля атрыманьня сумнае весткі аб сьмерці Карскага, нельга даць вычэрпываючае інфармацыі аб дзеяльнасьці яго. Праўда, узгадаваны ў расейскім духу Карскі ніяк ня мог праняцца нашай адраджэнскай ідэолёгіяй і асабліва няпрыязна адносіўся да незалежніцкага кірунку, што і адбілася на зьмесьце выданай у 1922 годзе трэцяй часткі III-га тому „Беларусаў“, пасьвячонай новай беларускай літэратуры. Але той вялізарны ўклад, які зроблены ім у навуковую скарбніцу, тыя досьледы аб беларускай мове, вынікі якіх зьмешчаны ў „Беларусах“, — гэта такія цэннасьці, што дзеля іх кожны беларус мусіць з пашанай скланіць галаву перад сьвежай магілай выдатнага вучонага.

1 МАЯ У ЭЎРОПЕ.

Дзень работніцкага сьвята прайшоў у Эўропе наагул досьць спакойна.

Як ведама, сьцяг рэвалюцыйнага сацыялізму, з якім да вайны выступалі сацыялістычныя партыі, цяпер нясуць камуністы. Бо-ж сацыялісты блізу ўсюду ўзялі на сябе ролю эвалюцыйнага паляпшэньня палажэньня работніцкай клясы ў межах істнуючага буржуазнага ладу — ў характэры ўплывовага і адказнага чыньніка дзяржаўнай улады. Дык толькі першамайскія маніфэстацыі камуністаў маюць рэвалюцыйны характар дый выклікаюць умешваньне паліцыі. Дык вось якраз паліцыя ў цэлым радзе дзяржаў прыняла свае меры, каб ухіліць магчымасьць забурэньняў, да якіх блізу ўсюды — па загаду з Масквы — рыхтаваліся камуністы.

Найбольш энэргічна выступалі сацыялісты і камуністы 1 мая ў Нямеччыне. У Бэрліне адбыліся 2 вялікія маніфэстацыі сацыялістычныя і 1 камуністычная. На аднэй з першых сказаў

(гл. на адвароце)

цікаўную прамову старшыня клясавых праф. саюзаў Нямеччыны Брэдов, які, кажучы аб пасьпехах сацыялізму, сказаў, што цяпер дамаганьне 40-гадзіннага тыдня працы зьяўляецца лягчэйшым да зьдзейсьненьня, чым да вайны лёзунг 8-гадзіннага дня працы. Ня так мірна скончыўся мітынг камуністаў, якія пачалі заклікаць да забастоўкі. Узьнялася бойка з гітлераўцамі, якая хутка перайшла ў рэзіна-рэвальвэравы бой з паліцыяй. У выніку — некалькі раненых.

У Парыжу і Францыі наагул дзень 1 мая прайшоў спакойна. Мітынгі і маніфэстацыі скончыліся мірна. Толькі трэба дадаць, што напярэдадні сьвята паліцыя зрабіла шмат „прэвэнцыйных" арыштаў сярод камуністаў.

Найбольш зацікаўленьня сьвяткаваньне міжнароднага сьвята работнікаў выклікае ў Гішпаніі, дзе новы рэвалюцыйны ўрад абвясьціў 1 мая афіцыяльным сьвятам Гішпаніі. Усе ўрадавыя ўстановы, усе магазыны былі зачынены, усялякая камунікацыя была спынена, газэты ня выйшлі. Толькі дактаром было дазволена карыстацца прыватнымі аўтамабілямі ў разе патрэбы. У сталіцы адбылася вялізарная маніфэстацыя ўрадавай сацыялістычнай арганізацыі і генэральнага Саюзу Працаўнікоў, якая пасьля паходам пайшла да прэм'ера Заморры і падала яму прынятыя ў рэзалюцыі дамаганьні. У адказ на гэта Заморра выйшаў на балькон і ў гарачай прамове заявіў народу, што гэтыя дамаганьні працаўнікоў і работнікаў урад паставіў ужо галоўнымі пунктамі сваёй праграмы.

У Англіі — у Лёндане маніфэстацыі прайшлі спакойна, — але вяла. Вялізарныя, але таксама спакойныя маніфэстацыі работнікаў адбыліся ў галоўных прамысловых асяродках Індыі.

У драбнейшых дзяржавах — Вэнгрыі, Літве, Аўстрыі, Баўгарыі, Швэцыі і інш. дзень 1 мая прайшоў спакойна, калі ня лічыць некалькіх выпадкаў сутычак паміж паліцыяй і камуністамі.

Асаблівы зусім характар сьвяткаваньне 1 мая мела ў СССР, дзе ўрад не пашкадаваў газэтнай паперы ды чырвонай тканіны, ня кажучы ўжо аб языкох ды горлах афіцыяльных горладзёраў на праслаўленьне „дасягненьняў камуністычнай рэвалюцыі". Навінай для чырвонай Масквы зьявілася новая форма камуністычнай „міліцыі" ці прасьцей — паліцыі, апранутай у зялёныя англійскія плашчы ды... белыя рукавіцы. Цэнтрам сьвята была вялізарная маніфэстацыя, з ваенным парадам у прысутнасьці ўсіх найвышэйшых сапоўнікаў чырвонай дзяржавы, паслоў, дэлегацыяў замежных кам. партыяў і т. д.

У Польшчы дзень 1 мая прайшоў наагул так сама спакойна.

За голадам і галітаю йдуць заразныя хваробы. Памятай аб гэтым і хутчэй давай ахвяру на пацярпеўшых ад разводзьдзя.

Konto P. K. O. Nr. 82.100.

ПАЛІТЫЧНАЕ ЖЫЦЬЦЁ.

Польшча.

Польска-гданскі канфлікт.

Канфлікт Польшчы з вольным местам Гданскам (Данцыгам) паглыбляецца. Блізкая ўжо маёвая сэсія Рады Лігі Нацыяў мае ў сваей праграме пытаньне аб залагоджаньні распаліўшыхся ды пагражаючых мо' нават агульнаму міру польска-гданскіх стасункаў. Нямецкая прэса ўсьцяж нападае на Польшчу, якая быццам не выпаўняе прынятых на сябе абавязкаў адносна Данцыга. Справа ў тым, што Польшча мае права, але і павінна карыстацца Данцыгам толькі, як гандлёвым портам, а таму побач з ім выбудавала сабе ваенны порт у Гдыні. Дык вось нямецкая прэса закідае Польшчы, што яна прадаўжае „тымчасова" карыстацца Гданскам, як ваенным портам, але з Гдыні робіць так сама гандлёвы порт, адцягваючы таварны рух ад Гданску, руйнуючы такім чынам гэты порт, а тым самым траціцца, зразумела, і сэнс далучэньня нямецкага Данцыгу да Польшчы ў форме вольнага места, якое, як сказана, павінна служыць перад усім гандлёвым „выхадам да мора" для ўсяго польскага „гінтэрлянду" (экапамічнага абшару краю).

Вось у гэтым — адна з галоўных прычынаў усьцяж завастраючыхся ўзаемных адносінаў Гданску і Польшчы, з свайго боку ўсьцяж растраўляных нямецкімі „нацыянал-сацыялістамі".

Характэрна, што нядаўна нават камісія рэчазнаўцаў Лігі Нацыяў, як даносіць нямецкая прэса, прызнала быццам, што Польшча не выпаўняе сваіх абавязкаў адносна да Гданску. (?)

Новая сэсія Сойму.

Газэты пішуць, што ў лоне ўраду ідуць важныя нарады — у справе склікаьня новай надзвычайнай сэсіі парляманту, праграму якой якраз быццам і апрацоўвае цяпер урад. Сэсія мела-б распачацца 25 траўня і працягнуцца даўжэй, як апошняя.

Польскія біскупы аб рэформе Констытуцыі.

Польскі каталіцкі япіскапат прадставіў ураду і заканадаўчым палатам мэмарыял, у якім робіць крытычныя ўвагі на ведамы праект рэформы Констытуцыі клюбу Б. Б. з пункту гледжаньня інтарэсаў каталіцкага касьцёла і рэлігійнага ўзгадаваньня моладзі.

Характэрна трэбаваньне, каб з § 129 Констытуцыі былі выкінены словы — аб „роўнапраўнасьці іншых вызнаньняў" — побач з „чаловым становішчам каталіцкага касьцёлу" у Польшчы...

Дражніць каталіцкіх біскупаў гэтая „раўнапраўнасьць" — нават толькі напісаная на констытуцыйнай паперы!..

Новы закон.

Прыняты ў часе бюджэтнай сэсіі закон аб шляхавым фондзе пакуль што, здаецца, прычыняе больш шкодаў ды стратаў краю і скарбу, як карысьці. Закон, маючы задачай стварыць асобны вялізарны капітал, з якога грошы маюць ісьці на пляновую будову добрых шляхоў у краі, прынцыпова — бяспрэчна карысны, нават неабходны для краю. Але зьбіраць цяпер — у часе такога страшэннага крызісу — гэты капітал аказалася вельмі цяжка, блізу немагчыма. Бо-ж новы закон фактычна накладае на згалелшае насяленьне новы падатак. Напрыклад — гэты закон ужо блізу цалком спыніў у 5 ваяводзтвах усялякі аўтабусавы рух, для разьвіцьця якога закон якраз і мае стварыць гэты шляхавы фонд, ці капітал!.. А цяпер, калі скарбовыя ўлады загадалі — паводле гэтага закону — ўсім аўтабусавым прадпрыемствам унясьці падатак за ўвесь год наперад, тыя масова заяўляюць, што для іх выгадней стрымаць рух, як руйнавацца адразу такім падаткам.

Закон гэты таму — яўна няўдалы, бо дасягае мэты адваротнай, якую ставіць яму заканадаўца.

Водгукі выбарау.

4 траўня Найвышэйшы Суд распачаў разгляд пратэстаў і скаргаў у зьвязку з апошнімі выбарамі ў парлямант. Першае паседжаньне, на якім меў разглядацца пратэст проці выбараў у вокрузе № 48 (Перамышль), скончылася адкладам справы.

Безрабоцьце у Польшчы зьмяншаецца.

За апошні тыдзень лічба безработных у Польшчы зьменшылася на 7.741. Аднак агульная лічба іх дасягае яшчэ 855 зьлішкам тысяч.

Заграніцай.

Чарговая сэсія Рады Лігі Нацыяу.

Пачынаючаяся ў бліжэйшыя дні чарговая сэсія Рады Лігі Нацыяў мае быць нязвычайна багатай зьместам, праграмы і напружаньнем барацьбы. Даволі сказаць, што Рада мае разглядзець справу мытнага аб'яднаньня Аўстрыі з Нямеччынай, справу, якая выклікала нябывалае ад часу рурскай акупацыі завастрэньне стасункаў між Францыяй і Нямеччынай.

Толькі што — усьлед за Брыянам — і парлямант — вялізарнай большасьцяй, за выняткам толькі сацыялістычнай і камуністычнай лявіцы, патрэбаваў, каб урад не дапусьціў гэтага злучэньня Аўстрыі з Нямеччынай. А гэтыя — вуснамі сваіх дзяржаўнікаў — усьцяж — спакойна, але рашуча — паўтараюць, што будуць вясьці пачатую

С. БАРАНСКІ.

НЕАДБЫТЫЯ ХАЎТУРЫ.

— Нудна стала жыць у беларускай вёсцы. Вайна скончылася, людзей напладзілася аж залішня, а паехаць няма куды. Даўней, бывала, людзі мелі звычай шаптаць пацеры па цэрквах і касьцёлах, вечарам у сьвята рэзаліся ў карты і неяк час забівалі. А сягоньня? Глядзець няхочацца на такое жыцьцё. Глядзі вечна ў тыя самыя суседзкія фізіі, з чужых ніхто ў вёску і наса не пакажа. Хіба толькі паліцыянт, каморнік ды сэквэстратар. І газэты цяпер ня тое. Я, праўда, сам ня чытаю, але, бывала, калі табе хто пачытае, то ёсьць што паслухаць: там некага машына зарэзала, там нехта сам застрэліўся, заграніцай, глядзіш, англічанка ўсё ваявацьзьбіраецца ня то з Швэдам, ня то з Туркам. А сягоньня пашлі газэты, дык зжалься Божа! Усю газэціну табе сусед перасылябізуе, і ніхто нідзе, аказваецца, на вяроўцы не забалтаўся, ніхто з рыштаваньня лабом аб брук ня грымнуў, ніхто тамабіль ня прыпрасаваў, і нідзе банку бандыты не ачысьцілі. І што за мэта чытаць такую газэту? Тамжа нічога няма, тольк: усьведамленьне, адраджэньне і ізноў усьведамленьне. Здаецца, і панашаму, а чорт ведае што яно значае!

Наракаў-бы так сабе Мацей Галуб перад суседам і далей на сваё нуднае жыцьцё, седзячы на прызьбе, каб яму не перашкодзіў пастух Сеўка. Ён пад прыскоранае дыханьне ад хуткага бегу, мокры ад поту, крычаў:

— Хутчэй да возера — Рыгаровіч утапіўся!

Праз дзесятак мінут ля возера сабралася вялікая грамада. Кожны, хто прыляцеў, пытаў неспакойна:

— Дзе ўтопленік?

Але непатрэбны быў адказ таму, хто кінуў вокам на возера.

На шагоў дваццаць ад берагу, на даволі вялікай глыбіні, стаяла непарушна па спакойнай вадзе рыбацкая „душагубка", зробленая з грубой сасновай калоды. Праз берагі лодкі віднелася перакіненая мокрая сетка — уласнасьць Рыгаровіча. Да яго-ж належаў і саламяны капялюш, што стаяў ля лодкі на вадзе белай плямай. У прысутных ня было сумніву, што Рыгаровіч ляжыць непадалёку на дне возера. На беразе ляжала астаўленая ім марынарка.

Праз паўгадзіны ў возера закінулі невад. Рыба лавілася, як ніколі, але напрасна сабраўшыся натоўп хацеў бачыць у сетках утопленіка.

Найбольш энэргічна працаваў Мацей Галуб.

— „Што будзе, калі ня знойдзем?" — думаў сабе — „якія-ж гэта будуць хаўтуры без нябошчыка? Як тут пяяць хаўтурныя песьні, пераліваючы іх на перадышку чаркай гарэлкі"?

А людзей на беразе ўсё прыбывала. Яны кідалі работу ў полі і беглі да возера. На тварах малявалася трывога і няпэўнасьць: зловяць, ці не?

У грамадзе паявілася Агата Янкі Кульгавага. Зьбірала яна грыбы непадалёку возера і, убачыўшы зборышча, не магла не пацікавіцца, што робіцца.

— Кірмаш перанясьлі на возера, ці што? — зажартавала звонка.

— Няма жартаў — чалавек утапіўся! — з дакорам заўважыў адзін з суседзяў.

— Хто?

— Рыгаровіч.

— „Утапіўся? А хто ж гэта сьпіць у сасоньніку, прыпякаючы бок на сонцы" — пераляцэла праз думку Агаты, і, паставіўшы грыбы на сепажаці, яна рынулася назад, скуль прышла.

Праз пару мінут Агата апынулася на невялічкай палянцы, залітай гарачымі праменьнямі сонца. На ёй, як на каралеўскім ложы, ляжаў, выцягнуўшыся на ўвесь рост, Рыгаровіч, герой дня, і хроп, аж захлiпаўся.

Нахілілася і пачала яго тузаць за локаць!

— А каб-жа цябе.. Во які нябошчык? Ха ха, ха, сеткай хочуць злавіць.

Але тут схамянулася і загаварыла спакойна, тузаючы сьпячага мацней.

— Пранук, падла, што-ж ты сьпіш? Гэта-ж тваімі сеткамі рыбу ловяць! Ці ты ім пазволіў?

Гэта памагло. Працёр вочы кулаком і бягом кінуўся да берагу.

— Я ім пакажу! Хто гэта сьмее браць сетку бяз майго дазволу?

Праз пару мінут Рыгаровіч агарнуў вокам увесь няштодзенны абразок: на возеры ў лодках мучыліся з сеткамі ягоныя суседзі з вёскі. Там бязумоўна была і яго сетка. На беразе густым натоўпам стаялі знаёмыя яму людзі і трывожна ўглядаліся на лодкі. Незамечаным падыйшоў ён да самай грамады.

— Што за зьдзек? Хто пазволіў? — крыкнуў раптам Рыгаровіч у бок лодак.

Прысутныя агледзеліся ў бок добра ім знаёмага голасу,

— У імя Айца — запішчэла нейкая баба, матаючы машынальна рукой каля носу.

— Трымайце нябошчык! — з хохатам здалёку закрычала Агата, бегшая сьлядамі Рыгаровіча, — бо ўцячэць з хаўтураў. Хроп, бэстыя, у сасоньніку.

Грамада як на каманду загрымела даўгім, беспрарыўным сьмехам. Дакаціўся ён і да людзей у лодках.

Уся ратунковая акцыя раптоўна стрымалася. Некатарыя з лодкі, убачыўшы Рыгаровіча жывым, дружна падтрымалі сьмех, што далятаў з берагу. Толькі Галуб плюнуў з агідай і радасьці агульнай не падзяляў. — „Гэтулькі людзей натрывожыць і... усё напрасна", — падумаў.

(Канец будзе).

акцыю аб'яднаньня да канца, бо-ж гэта — іх унутраная справа.

Барацьба будзе нязвычайна драматычнай.

Далей — на чаргу дня сэсіі пастаўлены нявменш палючыя справы — чарговага канфлікту паміж Польшчай і Гданскам, а так сама рад нявырашаных дагэтуль польска-літоўскіх спораў. Апроч таго, як ведама, польскі ўрад павінен будзе здаць справаздачу Лізе аб тых мерах, якія ён прыняў для здаволеньня пакрыўджанай у часе выбараў нямецкай меншасьці ў Сілезіі, а так сама — даць адказ на скаргі ўкраінскай меншасьці ў часе так зван. „пацыфікацыйнай акцыі“ ў Усходняй Галічыне.

Як бачым, усе справы страшэнна пякучыя...

У часе гэтага зьезду сусьветных дыплёматаў маюць адбыцца яшчэ і чарговыя сэсіі раду сталых і спэцыяльных камісіяў ды камітэтаў Лігі, як напр., так зван. „Камітэту 13“, які мае важнае заданьне: „апрацаваньне дадатковых спосабаў папярэджаньня магчымасьці вайны“, і інш.

Усё гэта зьвяртае на чарговую сэсію Рады Лігі Нацыяў асаблівую ўвагу ўсяго сьвету.

«Міма вушэй».

Амэрыканскі прэзыдэнт Хувэр заявіў, што ўсе прапазыцыі ды рэзалюцыі парляманту аб пераглядзе справы эўропэйскіх даўгоў і мытнай палітыкі — на карысьць Эўропы, ён — „пусьціў міма вушэй“. Такім чынам — усе спадзяваньні на тое, што Амэрыка зьменіць сваю забойчую для Эўропы мытную палітыку, або пойдзе хаця-б на частковае скасаваньне ваенных даўгоў, а тым самым — пасрэдна — падтрымае дамаганьні Нямеччыны аб новым пераглядзе „пляну Юнга“, — трэба лічыць беспадстаўнымі. Ці высуне ўсё ж цяпер-жа нямецкі ўрад, ня гледзячы на гэтую заяву Хувэра, дамаганьне аб пераглядзе пляну сплаты адшкадаваньняў, — няведама.

Кампанія старшыні Банку Лютэра за зьмяншэньне адшкадаваньняў.

Старшыня Нямецкага Дзяржаўнага Банку, былы прэм'ер, доктар Лютэр, вярнуўшыся з Амэрыкі, куды езьдзіў за падтрыманьнем у справе новага зьмяншэньня адшкадаваньняў, распачаў шырокую агітацыю ў Эўропе за перагляд „пляну Юнга“. Доктар Лютэр словам і пісьмом даводзіць, што галоўная прычына катастрафічнага крызісу ў Нямеччыне — гэта, непадсільныя для зьбяднеўшага яе насяленьня адшкадаваньні. Калі „ваенныя крэдытары“ Нямеччыны, кажа Лютэр, не зразумеюць гэтага, дык пашкодзяць ня толькі Нямеччыне, але-ж і сабе. Бо-ж — толькі гаспадарчая катастрофа Нямеччыны можа пусьціць у заходнюю Эўропу запраўды сільны камуністычны рух, які пачне тады рабіць тутака свае „парадкі“.

Выбар новага прэзыдэнта у Францыі.

13 траўня Нацыянальнае Сабраньне Францыі (злучанае паседжаньне сойму і сэнату) павінна прыступіць да выбару новага прэзыдэнта на мейсца канчаючага свой тэрмін прэзыдэнта Думэрга. Прэзыдэнт Францыі павінен быць выбраным абсалютнай большасьцю (больш як палова) усяго сабраньня. Таму выбары могуць зацягнуцца, бо-ж францускі парлямант складаецца з значнага ліку невялікіх, але звычайна варожых адна да аднэй фракцыяў, якія павінны неяк дайсьці да нейкага кампрамісу. Але новы прэзыдэнт, выбраны 13 траўня, яшчэ цэлы месяц будзе толькі «рыхтавацца» да пераезду ў Люксэмбурскі палац (сядзіба прэзыдэнта), а выступаць афіцыяльна — яшчэ да 13 чэрвеня — будзе стары прэзыдэнт.

Хто будзе выбраны новым прэзыдэнтам, няведама, бо-ж на прэзыдэнцкіх выбарах у Францыі часта адбываліся неспадзяванкі. Найбольш шансаў аднак-жа мае Брыян, які, як кажа апошняя вестка (?), толькі што афіцыяльна даў згоду на выстаўленьне сваей кандыдатуры.

Прэзыдэнта Францыі прыняга называць «вязьнем люксэмбурскага палацу». Гэта значыць, што ён — паводле канстытуцыі — ня мае ніякай улады ў дзяржаве ані ўплыву на палітыку. Праўда — ўсеўладны Парлямант Францыі мае фактычна сілу нават скінуць прэзыдэнта перад канцом яго паўнамоцніцтваў, як гэта зрабілі большасьць сойму і сэнату ў 1922 г., змусіўшы падацца ў адстаўку тагачаснага прэзыдэнта Мільерана, калі той пачаў вясьці «сваю палітыку» — проці волі парляманту.

Але тая зацятая кампанія, якая пачала разгарацца навокал прэзыдэнцкіх выбараў цяпер, кажа аб тым, што асоба прэзыдэнта ўсё ж мае першараднае значэньне. Сваім асабістым уплывам прэзыдэнт Францыі, як і англійскі кароль, які так сама «толькі царствуе, але не ўпраўляе», можа зьявіцца часам рашучым чыньнікам палітычнага жыцьця краю.

Чарговая канфэрэнцыя Малой Антанты.

3—5 траўня ў Бухарэшце адбылася чарговая канфэрэнцыя дзяржаваў так-званай Малой Антанты (Румыніі, Югаславіі і Чэха-Славакіі), Канфэрэнцыя выдала камунікат, які сьцьвярджае іх «поўную аднамыснасьць у ўсіх галоўных пытаньнях бягучай эўрапэйскай палітыкі» у справе аўстрыяцка-нямецкай мытнай уніі, Брыянавай «Пан Эўропы» і інш. Пастаноўлена па ўсіх гэтых справах выступаць у Лізе Нацыяў «адзіным фронтам» (?). Канфэрэнцыя сцьвярдзіла, што міжнародавае палажэньне ў Эўропе ў сучасны мамэнт — вельмі напружанае і цяжкое. Таму М. Антаньце трэба асабліва трымацца кучы.

Кароль румынскі «робіць» новыя выбары.

Як можна было прадбачыць, новы румынскі прэм'ер Іорга, стары прыяцель і ўзгадавальнік караля Карла, зараз-жа пасьля сваей праграмнай прамовы распусьціў парлямант і назначыў новыя выбары. Бо-ж у гэтым парляманце вялізарную большасьць — на запраўды-ж чыстых і чэсных выбарах, — адбытых без усялякай „дапамогі“ з боку ўсемагутнай у Румыніі „сігуранцы“ (палітычнай паліцыі), здабыла нацыянальна-сялянская партыя, з Маніу на чале. Дый хаця гэты Маніу — з „вялікай пашаны да караля“ — згадзіўся цалкам падтрымліваць у парляманце назначаны каралём урад Іоргі, але сам прэм'ер, як „шчыры парлямантарны дзеяч“, хоча, зразумела, мець у сойме „ўласную большасьць“, хаця ўся яго партыя — румынская эндэцыя — ня мае ніякіх карэньняў у краі... Але-ж напэўна можна сказаць, што пакліканая ізноў ласкавая пані „сігуранца“ зробіць пажаданы для „шчырага парлямантарыя“ праф. Іоргі „цуд“, і новыя выбары гэтую большасьць яму дадуць цалком.

Новыя выбары маюць адбыцца ў шалёным тэмпе. „Выбарны апарат“ сігуранцы захаваны ў поўнай цэласьці. Так, што новы парлямант ужо 15 чэрвеня мае распачаць працу. Урад Іоргі працуе цяпер над укладаньнем „урадавага сьпіску кандыдатаў“, з якім мае выступіць на выбарах. Сьпісак гэты толькі 40 прац. мандатаў дае прадстаўнікам палітычных партыяў, дый, зразумела, толькі тых, якія ўваходзяць у блёк з урадам. 60 прац. усіх мандатаў Іорга захаваў для сваей партыі, а так сама для прыхільных да яе прадстаўнікоў розных не палітычных, але прафэсыянальных арганізацыяў. Такім чынам выбары маюць адбыцца пад лёзунгам „нацыянальнага адзінства“, ці „беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з урадам“.

Цікаўна, што так спрытна ашуканая каралём „нацыянальна сялянская партыя“ толькі цяпер — пасьля неспадзяванага для яе роспуску яе парляманту — пераходзіць у апазыцыю, ладзючы ў выбарнай кампаніі вострую, але-ж пеўне ж і безнадзейную барацьбу з урадавым блёкам поруч з сацыялістамі... Характэрна і тое, што разьбітыя дарэшты па апошніх — чыстых — выбарах, даўшых вялізарную большасьць сялянству, пядаўныя даўгалетнія валадары Румыніі „лібэральныя“ магнаты-абшарнікі і прамысloўцы радасна кляскаюць роспуску „мужыцкага парляманту“ і ладзяць паразуменьне з урадам.

Такім чынам — той самы кароль Карл, якога выгналі з краю якраз гэтыя „лібэралы“ ў паразуменьні з яго бацькам, а пасьля сьмерці апошняга некалькі гадоў ня пускалі да краю, цяпер „адбудоўвае“ іх панаваньне ў краі, панаваньне над тым сялянствам, якое ў асобе сваіх прадстаўнікоў у парляманце — правадыроў „нацыянальна-сялянскай партыі“ — якраз і вярнула яго, гэтага выгнанага караля, назад у край, аддаўшы яму трон.

Так заўсёды і дастаецца таму дурному мужыку, які караля ды пана больш любіць, чым шануе сябе і сваю волю.

Канец паўстаньня на Мадэры

Паўстаньне на востраве Мадэра, праклямаваўшае незалежнасць вострава ад Партугаліі, скончылася поўным правалам. Партугальскія ўлады здолелі высадзіць на востраве значны ваенны атрад, які хутка змусіў мясцовых ваяўнічых „незалежнікаў“ да поўнай пакорнасьці. Партугальскі губэрнатар, які быў уцёкшы, ізноў вярнуўся ў свой палац, і ўсё пайшло па старому — да новага „выбуху рэвалюцыі“, якімі ў Партугаліі наагул вясёлы народ вельмі любіць „разнаіціць“ залішне спакойна плывучае ў нашыя мірна-гандлёвыя часы жыцьцё. Але авантурна-вясёлы партугальскі народ вельмі ня любіць, відаць, неабходнага для кожнай рэвалюцыі ці паўстаньня праліву крыві, асабліва-ж сваей уласнай. Дык, як толькі з пад'ехаўшай да „ахопленага пламем паўстаньня“ вострава „старой калёшы“ бухнула пара гранатаў, дый яшчэ ў дадатку асколак аднэй з іх некага раніў, дык зараз-жа „пламя паўстаньня“ пачало чадзець ды гаснуць... А тым часам — вярнуўся на сваё мейсца і пан губэрнатар.

Канец урадавага крызісу у Баўгарыі.

Зацягнуўшыся ўрадавы крызіс у Баўгарыі скончыўся неспадзявана. Усе зробленыя каралём — шчыра ці няшчыра — „канстытуцыйныя“ спробы тварэньня новага, маючага шырэйшую падставу ў краі, Ураду не дайшлі, як ведама, да скутку. Дык тады былы прэм'ер Ляпчэв — у паразуменьні з каралём — проста ўзяў, сваю адстаўку назад. А з ім вярнуўся да ўлады ў поўным складзе і ўвесь яго габінэт.

Кароткія навіны.

— Гандлёвы трактат між СССР і Італіяй. 27 красавіка падпісаны ў Рыме гандлёвы трактат паміж СССР і Італіяй, які прадбачыць паміж іншым радавыя заказы італьянскім фабрыкам на 150 мільён. ліраў. Трактат выклікаў вялікае здаваленьне ў італьянскай прэсе дый наагул смачна гаспадарча „забяліў“ прыязныя палітычныя стасункі паміж маскоўскім камунізмам і фашыстаўскай Італіяй.

— Канадзкі ўрад адмовіўся ад прапазыцыі з боку Літвінава даць замову канадзкім фабрыкантам на сельска-гаспадарчыя машыны на суму 10 мільёнаў дал., забараніўшы адначасна цалком увоз у Канаду радавых тавараў, ак выробляных нявольніцкай працай...

Афіцыяльны орган ватыканскага (папскага) ўраду горача хваліць канадзкі ўрад за гэтыя пастановы, а гэтым самым укосна ганіць тую гаспадарчую прыязьнь італьянскага ўраду з Масквой, якую аднадушна выхваляе ўся ўрадавая — фашыстоўская — прэса Італіі.

— Нямеччына аб радавым „падрыўным экспорце“. У адноўленым радава-нямецкім гандлёвым трактаце Нямеччына абавязалася процідзеяць барацьбе буржуазных дзяржаваў проці радавага „падрыўнога экспорту“ (ці вывазу тавараў па цэнах танейшых сабевартасьці). Гэты пункт трактату, прафарсаваны Масквой, выклікаў трывогу ў колах нямецкіх прамыслоўцаў.

— Японская прэса зьмяшчае сэнсацыйную вестку аб тым, што паміж СССР і Кітайскім урадам ідуць перагаворы аб прадажы Кітаю Ўсходня-Кітайскай чыгункі за якую, як ведама, тры гады таму назад ішла крывавая вайна між Радамі і Кітаем.

— Францускія камуністы — шпіёны Масквы. Францускія камуністы шчыра працуюць на карысьць Масквы, як дзяржавы, усьцяж займаючыся шпіёнствам — палітычным, гаспадарчым і ваенным. Так нядаўна арыштавана ізноў некалькі францускіх камуністаў, якія арганізоўвалі гаспадарчы шпіёнаж на фабрыках і заводах амуніцыі.

— Новы зьезд расейскай эміграцыі. З пачыну пражскай групы расейскіх эмігрантаў мае наладзіцца новы зьезд эміграцыі расейскай, які мае мэтай аб'яднаньне ўсіх эміграцкіх групаў, якія дагэтуль вядуць між сабой страшэнную барацьбу — ня горш як нашыя беларусы ў Польшчы.

— Францускі парлямант — 540 галасамі проці 6 — выразіў сымпатыі францускага народу Гішпанскай рэспубліцы. Камуністы аднак-жа заявілі, што крыху пачакаюць з выражэньнем сваёй сымпатыі — пакуль Гішпанская рэспубліка ня зробіцца... радавай. Узьнікла спрэчка між камуністамі і сацыялістамі, якая скончылася бацьляй.

— Залаты запас Францыі дайшоў да нябывалай сумы, звыш 2 з чвэрцю мільярдаў даляраў. Радавая прэса, падаючы гэтую вестку, аж гарыць са злосьці, што такі вялізарны капітал ляжыць мёртвым, а галоўнае — ня хоча ехаць у СССР, дзе пэўне-ж яго хутка б зьелі жыўцом!

— У Баўгарыі, — трэба думаць, — у зьвязку з урадавым крызісам, адбыліся вострыя сутычкі паміж фашыстамі і камуністамі. Вярнуўшыся да ўлады ўрад Ляпчэва арыштаваў 200 камуністаў за наладжаную імі дэманстрацыю. Гэта разьвязала рукі фашыстам, якія разграмілі ды зруйнавалі цалком цэнтральныя ўстановы камуністычнай партыі.

— Зьмяншэньне пасольскіх пэнсіяў у Бэльгіі. Бэльгійскі парлямант пастанавіў — 92 галасамі проці 75 — зьменшыць пэнсіі дэпутатам на 10 процантаў.

— Недахоп 53 мільён. злотых. Афіцыяльна сьцьверджана, што ў бюджэце мінулага 1930—1981 году выдаткі дасягалі 2 мільярд. 801 мільён. зл., а даходаў было толькі 2 мільярды 747 міл. Такім чынам бюджэтны недахоп у мінулым годзе дайшоў сумы 53 мільёны зл., які трэба будзе пакрыць з даходаў бягучага бюджэтнага году.

КАРЭСПАНДЭНЦЫІ

Культурная праца.

(м. Смаргоні, Ашмянскага павету).

Як толькі можна запамятаваць, нашая моладзь яшчэ ніколі гэтак не гарнулася да беларускае кніжкі, як гэта ёсьць цяпер.

Як толькі дайшла да нас вестка, што Цэнтрасаюз пачаў адчыняць па вёсках свае бібліятэкі-чытальні, нашыя хлопцы і дзяўчаты адразу пастанавілі зьвярнуцца да Цэнтрасаюзу ў справе адчыненьня бібл.-чытальні і ў нашым мястэчку, вызначаючы на кіраўніка бібліятэкаю Міхася Дурэйку. Да нашае просьбы Цэнтрасаюз прыхіліўся вельмі ахвотна, зрабіў адпаведныя захады перад уладаю і ў пачатку сакавіка с. г. мы ўжо атрымалі два добрых камплекты беларускіх кніжак (на 112 зл.), якія ў бібліятэцы злучылі разам з тымі кніжкамі, што наскладалі свае сябры.

Калі кніжкі былі ўжо ўпарадкаваныя і загадчык бібліятэкі пачаў іх выпазычаць, — праз некальк: дзён большая частка іх перайшла ў рукі чытачоў, якія прачытанымі кніжкамі праз бібліятэку-чытальню абменьваюцца. Гэтак да апошняга часу некаторыя з чытачоў прачыталі амаль усе кніжкі з бібл.-чыт., чэрпаючы з іх вельмі карысную для сябе веду, а гэтым самым — яшчэ больш выклікалі ў сабе запалу да кніжкі. Апошняе выяскравілася ў грашовых складках на папаўненьне бібл.-чытальні новымі кніжкамі.

Трэба спадзявацца, што моладзь нашая на гэтым яшчэ ня спыніцца, будзе далей весьці культурна-асьветную і ўсьведамляючую працу, здабываючы сабе што раз больш і больш прыхільнікаў сярод мясцовага жыхарства.

На заканчэньне хачу яшчэ выказаць пажаданьне, каб думка некатарых нашых сяброў аб з'арганізаваньні побач з бібл.-чытальняю аматарскага драматычнага гуртка — хутка і памысна зьдзейсьнілася.

Змагар за асьвету.

Страты ад разводзьдзя у Наваградчыне.

Як даносяць віленскія газэты, страты, зробленыя разводзьдзем у Наваградчыне,— асабліва вялікія. Нябывала разьліліся ўсе вялікія і малыя рэкі ваяводзтва: Нёман, Шчара, Сэрвэч, Дзітва, Бярэзіна, Лебяда з іх прытокамі. Дакладна страты яшчэ ня могуць быць аблічаны, бо значная частка залітых палёў і лугоў дагэтуль яшчэ — пад вадой. Як сьцьверджана дагэтуль, 1500 гэктараў засеяных палёў зьнішчаны цалком, вялізарныя абшары лугоў — занесены пяском ды мулам; 102 дамы зьнесены цалком, 720 паважна пашкоджаны. Вялізарная маса — тысячы цэнтнараў бульбы ў ямах, сена, канюшыны — зьнесена вадой; шмат усялякага хатняга дабра, жывога і мёртвага інвэнтару ня здолелі адратаваць ад раптам надскочыўшай паводкі. Больш 2000 сямей панясьлі значныя страты, у тым ліку 670 зруйнаваны цалком. Утанула 9 асоб.

Асабліва цяжка адбіліся гэтыя страты на насяленьні таму, што яно ў прошлым годзе пацярпела страшэнна ад вялізарнай буры з градам (паветы: навурадзкі, стаўпэцкі і валожынскі). Тады шкодаў і стратаў падлічана было на больш за 4 з паловай мільёны, з чаго больш паловы выпадала на дробную сялянскую ўласнасьць.

Газэты пішуць, быццам усяго шкодаў і стратаў зроблена на 650.000 зл., ня лічучы папсаваных ды зруйнаваных мастоў і шляхоў. Але гэтая лічба — пэўне-ж значна паменшана. Блізу гэтулькі-ж налічана на масты і дарогі, пры чым на дзяржаўныя шляхі выпадае каля 100.000 зл. стратаў, а на самаўрадавыя дарогі — 550.000 зл. Найвялікшыя страты мае навурадзкі павет — каля 350.000, рэшта — блізу роўна палове — прыпадае на паветы стаўпецкі і валожынскі. Ясна, што самаўрады сваім коштам ня здолеюць пакрыць усіх гэтых стратаў. Патрэбна выдатная і хуткая дапамога з боку ўраду.

Страты у Дзісьне.

З Дзісны пішуць, што паводка цалком „змыла" 9 дамоў, 17 розных іншых будынкаў, 400 саж. дроў дый шмат іншага ляснога матэрыялу, што быў загатаваны на складах мясцовых лесапілак. Апроч таго пашкоджаны значна 32 дамы і 16 іншых забудаваньняў.

Усяго стратаў налічана пакуль-што на паўтара мільёна зл. Агульная лічба пацярпеўшых жыхароў дасягае 8 тысяч, з якіх каля 3 з палова тысяч разьмешчаны ў чужых кватэрах.

Чалавек-зьвер.

(Цагельня „Трынопаль").

Цагельня „Трынопаль" ёсьць уласнасьцю трох гаспадароў. Галоўным гэрштам над работнікамі да гэтага часу ёсьць адзін з супольнікаў па прозьвішчу Росахацкі. Гэта вельмі цёмная адзінка. Аб ягоных штучак усе тут ведаюць і аб іх маўчаць нельга. Вось яны:

У месяцы лютым купец Бройдо, супольнік цагельні, згадзіў гр. Місюля, як спэцыялістага, на працу ў цагельні. Калі п. Росахацкі даведаўся, што на цагельню зьявіўся без ягонага ведама чалавек, і думаючы, што гэта супольнік прыслаў чалавека дзеля кантролі над ім, — паклікаў сваіх „лепшых" работнікаў і навучаў іх, каб тыя выкінулі гр. Місюля з памешканьня дый „нагрэлі" яму бакі так, каб ён ужо далей не захацеў вярнуцца на цагельню. Па ўплыве нейкага часу, калі гр. Місюль ужо прыступіў да працы, яму здарылася захварэць. У сувязі з гэтым трэба было зьвярнуцца да Росахацкага, каб даў картку да Касы Хворых. Зімест карткі, Росахацкі са злосьцю накінуўся на Місюля і пачаў яго душыць за горла. Апошняму з вялікімі высілкамі ўдалося вызваліцца з кіпцюроў азьвярэлага гаспадара.

Гэты факт страшэнна абурыў усіх работнікаў цагельні, якіх умовы жыцьця нічым ня розьняцца над апекаю гэнага чалавека-зьвера.

Цяжка жывецца нашаму брату работніку!

Дзядок М.

Пісьмо у рэдакцыю.

Паважаны грамадзянін Рэдактар!

Ветліва прашу зьмясціць ніжэйпаданае ў газэце.

У № 10 „Беларускай крыніцы" с. г. у карэспандэнцыі пад загалоўкам: „Ад краснага знамені да белага арла", падпісанай „палескім", была зьмешчана лаянка на правадыроў Цэнтральнага Саюзу Белар. Арган. і Уст.

Вось-жа падаю да ведама, што я пісаў паведамленьне толькі аб залажэньні „Кола Млодзежы", паміж закладчыкаў якога аказаліся некатарыя бышыя грамадаўцы, а аб Цэнтрасаюзе і яго павадырах я нічога не ўспамінаў.

Пры гэтым зазначаю, што я не зьяўляюся староньнікам рознай сваркі і калатні паміж беларускімі арганізацыямі і жадаю, каб яны сваю энэргію, каторую аддаюць на лаянку, абярнулі на працу для дабра нашай гаротнай Бацькаўшчыны.

Б. Бабарыка.

ХРОНІКА

— Агульны Сход Беларускага Дабрадзейнага Т-ва. Ў нядзелю 3-га траўня б. г. адбыўся агульны гадавы сход сяброў Беларускага Дабрадзейнага Т-ва пад старшынствам грам. А. Луцкевіча. Дагляд аб дзейнасьці ўраду Т-ва зрабіла грам. А. Быхаўцава, у якім вельмі яскрава выявіла актыўнасьць у працы Т-ва ў мінулым 1930-31 годзе. Асабліва заслугоўвае ўвагі ўпарадкаваньне вучнёўскага інтэрнату. Пасьля дакладу скарбніка, паасобных сяброў ураду і рэвізійнае камісіі, сход удзяліў абсолюторыюм уступаючаму прэзыдыюму.

Зацьвярдзіўшы бюджэт на наступны год, сход выбраў новы ўрад у наступным складзе: грам. А. Быхаўцава, А. Сакалова, Н. Шнаркевічыха, Р. Астроўскі і М. Сіняўскі.

Кандыдатамі: А. Міхалевіч і В. Грышкевіч. У склад рэвізійнае камісіі ўвайшлі: А. Стракоўскі, Ант. Трэпка і Н. Лукашэвічыха. Кандыдаты — М. Ільяшэвіч, Кэнэль і Душкевічыха.

Сход пастанавіў мандаты прадстаўнікоў у „Цэнтрасаюз" лічыць вычэрпанымі і выбраў новых прадстаўнікоў. Гэтак гр. Акінчыц у склад Цэнтрасаюзу надалей не ўваходзіць.

Удзел у сходзе ўзяла вельмі значная частка сяброў Т-ва.

— Справа Бран. Тарашкевіча. Мясцовыя газэты даведаліся, быццам справа былага правадыра Грамады Бр. Тарашкевіча мае разглядацца ў Віленскім Акружным Судзе ў канцы чэрвеня б. г.

— Вярбоўка рабочых. У бліжэйшым часе ў Браслаўскім і Дзісьненьскім паветах пачнецца вярбоўка сельска-гаспадарчых работнікаў на сэзонныя работы ў Латвіі. Патрэбна ўсяго да 2000 чалавек.

— На дапамогу ахвярам разводзьдзя. Дзеля дапамогі ахвярам разводзьдзя ў Вільні стварыўся „Komitet Obywatelski niesienia pomocy ofiarom powodzi", які заклікае да збору грошаў. (Konto P. K. O. Nr 82,100).

Разьбітае ўнутранай калатнёй беларускае грамадзянства ніякае акцыі ў гэтым кірунку, ясна-ж, распачаць не магло і сваіх прадстаўнікоў у польскай арганізацыі ня мае.

— Ня піць сырой вады! У зьвязку з разводзьдзем на пацярпеўшых ад яго абшарах распаўсюджваюцца розныя заразьлівыя хваробы, якія шпарка разносяцца бруднай, застаяўшайся вадой дый яшчэ наагул завастраюцца пагоршыўшыміся варункамі жыцьця. Асабліва шырыцца тыфус.

Улады прымаюць меры дзеля барацьбы з гэтымі эпідэміямі, але і само насяленьне павінна дбаць ды прымаць усе меры для самаахова. Дык першы загад у гэтай самаахове — гэта ня піць ніколі негатаванай вады, нават з студняў, якія знаходзяцца ў раёне залітым вадой.

— Страты ад разводзьдзя ў Вільні. Віленскі Магістрат панёс ад разводзьдзя стратаў на 320 тысяч злотых. Але на работы па ўрэгуляваньню берагоў Вільлі і Вялейкі трэба будзе звыш 9 мільёнаў зл. Гэтыя лічбы, зразумела, не датычаць тых вялізарных стратаў, што панесьлі прыватныя асобы і іншыя ўстановы ў месьце.

Варункі прыйма у Беларускую Дзяржаўную Сэмінарыю.

Да ўступнага экзамену на I курс Дзяржаўнай Вучыцельскай Сэмінарыі ім. Фр. Багушэвіча ў Вільні можа быць дапушчаны той, хто скончыў 7 аддз. пачатковае школы ці 4 кл. гімназіі і ня мае ў дзень 31 жніўня 1931 г. болей 16 год.

Кантрольныя экзамены адбудуцца ў гэтым годзе паміж 15 і 25 чэрвеня з наступных прадметаў: 1. Польскае мовы (пісьменны — дыктоўка і вусны — чытаньне, апавяданьне і граматыка ў засягу праграмы пачатковае школы), 2. Беларускае мовы (пісьменны і вусны — так сама, як з польскае мовы), 3. Арытмэтыка (вусны і пісьменны — задачы на ўсе чатыры дзеяньні з звычайнымі і дзесяткавымі дробамі а такжа працэнтныя абліченьні, 4. Здольнасьці слуху (сьпеў).

Заявы аб дапушчэньні да экзамену прыймаюцца ў канцэлярыі Сэмінарыі да 15 чэрвеня г. г. уключна.

Да заявы трэба далучыць: 1) мэтрыку нараджэньня, 2) уласнаручна напісаны жыцьцярыс, 3) пасьведчаньне аб паўторным прышчэпе воспы, 4) апошняе школьнае пасьведчаньне, 5) дзьве фотаграфіі.

Перад дапушчэньнем да экзаменаў адбудзецца лекарскі агляд стану здароўя, кандыдатаў(так) дзеля сьцьвярджэньня здольнасьцяў, патрэбных для вучыцельскай прафэсіі.

УВАГА: Усялякія фізычныя калецтвы, як вонкавыя, так і ўнутраныя хваробы, напр. сухоты а таксама недахопы ў мове, будуць станоўчай перашкодай у прыйме ў Сэмінарыю.

Сэмінарыя — коэдукацыйная (мяшаная). Пры Сэмінарыі істнуюць інтэрнаты для хлапцоў і дзяўчат. Найздальнейшыя, а незаможныя вучні могуць рабіць захады аб атрыманьні ўрадовай стыпэндыі ў суме 40 зл. месячна. Аплата ў інтэрнатах выносіць 60 зл. у месяц. Плата за навуку 20 зл. у паўгодкі. Апроч таго 2 зл. у паўгодкі за лекарскую помач.

Кандыдаты(кі) на II курс будуць прыймацца выключна восеньню (паміж 15—30 жніўня г. г).

БЕЛАРУСКАЯ ГІМНАЗІЯ Бацькаўскага Камітэту

Ў ВІЛЬНІ [Вострабрамская 9].

З правамі Панствовых Гімназіяў

УСТУПНЫЯ ЭКЗАМІНЫ Ў ГІМНАЗІЮ ВЯСНОЮ 1931 Г. АДБУДУЦЦА ДЛЯ ПАСТУПАЮЧЫХ У I, II, III, IV, V, VI, і VII КЛЯСЫ Ў ЧЭРВЕНІ МЕСЯЦЫ, (А Ў ЯКІЯ ІМЕННА ДНІ — АБ ГЭТЫМ БУДЗЕ ПАВЕДАМЛЕНА АСОБНА). АПОШНІ ТЭРМІН ПАДАЧЫ ЗАЯВАЎ 10 ЧЭРВЕНЯ.

УВАГІ: 1) Да заявы павінны быць далучаны: а) мэтрыка аб нараджэньні, б) школьнае пасьведчаньне (тэй школы дзе вучыўся), а, калі з хатняй падгатоўкай, то пасьведчаньне ад гміны, ці паліцыі, а то сьвяшчэньніка, або ксяндза і в) лекарскае пасьведчаньне аб прышчэпе воспы і аб агульным стане здароўя. 2) У I-ую кл. прымаюцца ад $9\frac{1}{2}$ да 12 гадоў, у II — ад $10\frac{1}{2}$ да 13 гадоў, у III — ад $11\frac{1}{2}$ да 14 і г. д. Дзеці і пераросшыя гэтыя нормы, могуць быць прыняты ў адпаведныя клясы, калі Пэдагогічная Рады Гімназіі прызнае ўважнымі тыя прычыны, якія выклікалі гэтае спазненьне. Прычыны гэтыя павінны быць паказаны ў заяве.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Рэдактр-выдавец: М. СІНЯЎСКІ.
Друкарня А. ДВОРЖЭЦА Вільня, Завальная 32.